# РАЗДЗЕЛ І. БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ГРАМАДСКАЯ З'ЯВА І АБ'ЕКТ ВЫВУЧЭННЯ

## 1.1. Сучасная беларуская літаратурная мова як вучэбная дысцыпліна

Грамадства не можа існаваць без перадачы інфармацыі. Для забеспячэння зносін паміж людзьмі, для абмену думкамі прызначана чалавечая мова. Яна дазваляе найбольш рацыянальным спосабам атрымліваць і перадаваць любую інфармацыю.

Па розных даных, агульная колькасць моў на Зямлі складае ад 2,5 да 5 тыс. Акрамя таго, налічваецца ад 6 да 8 тыс. дыялектаў.

> Прыкладна палова моў прыпадае на 8 краін: Інданезію, Мексіку, Бразілію, Камерун, Індыю, Кітай, ЗША і Расію.

Беларуская мова ўваходзіць у сотню найбольш развітых моў свету. Яна з'яўляецца дзяржаўнай мовай Рэспублікі Беларусь. Паводле перапісу насельніцтва 1999 г. яе назвалі роднай 73,6% жыхароў Беларусі.

Беларуская мова з'яўляецца прадметам вывучэння шэрага лінгвістычных дысцыплін, што даследуюць яе гісторыю, сучасны стан, дыялектны склад, стылістычную сістэму і інш.

Курс "Сучасная беларуская літаратурная мова" змяшчае навуковую характарыстыку беларускай літаратурнай мовы на сучасным этапе яе развіцця і займае цэнтральнае месца сярод усіх лінгвістычных дысцыплін, якія выкладаюцца на беларусазнаўчых спецыяльнасцях філалагічных факультэтаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Аб'ект** вывучэння дысцыпліны – сучасная беларуская літаратурная мова.

**Мэта** дысцыпліны – выпрацаваць навуковы погляд на сучасную беларускую літаратурную мову і дасканала авалодаць яе сістэмай.

Курс "Сучасная беларуская літаратурная мова" цесна звязаны з такімі лінгвістычнымі дысцыплінамі, як "Беларускае мовазнаўства", "Гісторыя беларускай мовы", "Беларуская дыялекталогія", "Стылістыка беларускай мовы", "Методыка выкладання беларускай мовы", "Параўнальная граматыка ўсходнеславянскіх моў" і інш.

## 1.2. Структура дысцыпліны "Сучасная беларуская літаратурная мова"

Адзінкі мовы (фанема, марфема, слова, словазлучэнне, сказ) як элементы яе сістэмы маюць розныя функцыі і значэнні. Кожная з іх уяўляе сабой

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ